Мікола Цімошык
Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (Украіна)

ДА ПРАБЛЕМЫ АБ ЗМЯСТОЎНЫМ НАПАЎНЕННІ ПАНЯЦЦЯЎ «РЭДАГАВАННЕ» І «ЛІТАРАТУРНАЕ РЭДАГАВАННЕ»

Рэдагаванне як цэласны творча-арганізацыйны працэс складаецца з сукупнасці накіраваных на падрыхтоўку і выпуск канкрэтнага выдання разнастайных і паслядоўных дзеянняў аўтара або спецыяльна падрыхтаваных прафесіяналаў.

Тэарэтыкі выдавецкай справы здаўна вылучылі ў гэтым працэсе тры галоўныя аспекты: палітычны (або ідэалагічны); навуковы; літаратурны (або літаратурна-стылістычны).

Называючы такі падзел умоўным, М. Сікорскі, напрыклад, падкрэслівае: «Рэдактарскую працу над зместам рукапісу можна назваць палітычным і навуковым рэдагаваннем, а працу над формай рукапісу (яе кампазіцыяй, мовай і стылем) – літаратурным рэдагаваннем» [11, с. 253].

Навуковае абгрунтаванне літаратурнага рэдагавання «як неразрыўнай часткі цэласнага і складанага працэсу рэдагавання» ўпершыню ў савецкай тэорыі выдавецкай справы і рэдагавання прадставіў маскоўскі даследчык К. Былінскі, з імем якога звязана распрацоўка моўна-стылёвага аспекту тэорыі і практыкі рэдагавання

[1, 2]. Галоўнымі задачамі літаратурнага рэдагавання аўтар лічыць паляпшэнне мовы, стылю і кампазіцыі твора.

М. Сенкевіч таксама звязвае літаратурнае рэдагаванне з «формай моўнай дзейнасці» і да паляпшэння мовы, стылю і кампазіцыі дадае «ўсю структуру рукапісу» [10, с. 21].

З такіх жа пазіцый разглядаюць літаратурнае рэдагаванне і аўтары выдадзенага ў Маскве ў 1987 г. аднайменнага дапаможніка пад рэдакцыяй Н. Валгінай [5, с. 82]. У дапаможніку адлюстраваны тры аспекты гэтага віду рэдагавання: павышэнне інфарматыўнасці моўных адзінак; узмацненне стылістычных якасцей тэксту; выпраўленне моўных памылак і недакладнасцей.

Да гэтай групы вучоных мы можам справядліва аднесці і беларускага даследчыка тэорыі і практыкі літаратурнага рэдагавання М. Цікоцкага [14].

Больш поўна, на нашу думку, змест літаратурнага рэдагавання вызначыў А. Мільчын: «Літаратурнае рэдагаванне – рэдактарскі аналіз, ацэнка і ўдасканаленне сумесна з аўтарам літаратурнай формы твора, састаўная частка рэдагавання, якая вылучаецца ва ўмовах, калі навуковы ці спецыяльны рэдактар займаецца аналізам і ацэнкай зместу выдання выключна з боку навуковай ці спецыяльнай, у той час як аўтар мае патрэбу ў дапамозе і літаратурнай» [6, с. 194]. Канцэптуальны падыход да тлумачэння паняцця «літаратурнае рэдагаванне» расійскага калегі цалкам падзяляе ў сваім слоўніку львоўская даследчыца Э. Огар [7].

Сярод тых украінскіх вучоных, якія першымі ўсебакова даследавалі тэарэтычныя асновы работы рэдактара над літаратурнай формай твора ці літаратурную апрацоўку тэксту, трэба вылучыць Н. Зялінскую. Асноўным зместам навуковай і вучэбнай дысцыпліны «Літаратурнае рэдагаванне», на думку даследчыцы, з'яўляецца «менавіта літаратурная апрацоўка твора» [3, с. 5]. Звяртаючы ўвагу на тое, што ў літаратурны аспект рэдагавання даследчыкі часам укладаюць розны змест, Н. Зялінская адназначна не падзяляе спробы некаторых з іх тлумачыць гэтае паняцце «занадта шырока». Менавіта такім яна лічыць азначэнне літаратурнага рэдагавання В. Церахавай, якое варта разгледзець асобна. «Літаратурнае рэдагаванне – гэта сфера грамадска-палітычнай і ідэалагічнай работы, якая ўключае ў сябе ўсе бакі працы над рукапісам, гэта значыць адзіны творчы працэс, у які ўваходзіць ацэнка тэмы, праверка і выпраўленне вы-

кладу з пунктаў гледжання ідэалагічнага і фактычнага (навуковага, тэхнічнага, спецыяльнага), выпраўленне распрацоўкі тэмы і, нарэшце, літаратурная апрацоўка тэксту» (В. Церахава) [12, с. 3–4].

Уважлівае супастаўленне ўзятага ў двукоссе фрагмента тэксту В. Церахавай з вызначэннем паняцця рэдагавання К. Былінскім лёгка прыводзіць да высновы, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе аб простай падмене: да тэрміна «рэдагаванне» В. Церахава дадае «літаратурнае». Тым самым было падменена змястоўнае напаўненне двух абсалютна розных паняццяў – «рэдагаванне» і «літаратурнае рэдагаванне».

«Занадта шырока» трактуе паняцце «літаратурнае рэдагаванне» і ўкраінскі даследчык У. Рызун у сваім падручніку: «Літаратурнае рэдагаванне – гэта від грамадска-культурнай дзейнасці, звязанай з рэгуляваннем інфармацыйна-камунікатыўных працэсаў у грамадстве праз сродкі масавай інфармацыі і накіраванай на падрыхтоўку журналісцкага матэрыялу да друку ці выхаду ў эфір. Як від дзейнасці, літрэдагаванне з'яўляецца сістэмай прафесійных дзеянняў, накіраваных на выкананне вытворчых функцый, якія фарміруюцца ў выніку рэдактарскага аналізу журналісцкага матэрыялу пад уплывам рэальнай вытворчай сітуацыі» [9, с. 73].

Азначэнне У. Рызуна, з аднаго боку, развівае і дапаўняе падыходы папярэдніх даследчыкаў гэтай праблемы, а з іншага – не можа быць прынята безагаворачна, паколькі мае патрэбу ў адным прынцыповым удакладненні: усю складаную сістэму прафесійных дзеянняў, увесь гэты від грамадска-культурнай дзейнасці, звязаны з падрыхтоўкай тэксту да друку, вучоны называе не *рэдагаваннем*, а *літаратурным рэдагаваннем*.

Азначэнне літаратурнага рэдагавання як такога, якое поўнасцю накладаецца на паняцце рэдагаванне, супярэчыць прынятым у навуковай і вучэбнай літаратуры ўяўленням пра літаратурнае рэдагаванне як адзін з відаў рэдагавання ўвогуле, як састаўную яго частку, «якая вылучаецца толькі пры падзеле працы, калі навуковы ці спецыяльны рэдактар займаецца аналізам і ацэнкай зместу твора, што рыхтуецца да выдання, выключна з боку навуковай ці пазнавальнай, у той час як аўтар мае патрэбу ў дапамозе літаратурнай» [6, с. 194].

Аднак менавіта на адмаўленні такой трактоўкі літаратурнага рэдагавання і будуе свае аргументы аўтар украінскага падручніка

«Літаратурнае рэдагаванне». Так, ён крытыкуе пазіцыю Д. Грыгараша, які адводзіў літаратурнаму рэдагаванню толькі лінгвістычную ролю [9].

Можна прыводзіць і іншыя аргументы аўтара гэтай канцэпцыі на карысць перайменавання складанага працэсу рэдагавання ў літаратурнае рэдагаванне, а тэорыю і практыку рэдагавання – у «навуку аб літаратурным рэдагаванні». Але звернемся да рэакцыі навуковай думкі на гэтае новаўвядзенне. Натуральна, што яно спачатку не магло не мець апанентаў.

Першым з вучоных, які не падтрымаў такую шырокую трактоўку літаратурнага рэдагавання, быў З. Партыка. Ён дакладна выказаў сваю пазіцыю: «Тэрмін “літаратурнае рэдагаванне”, які апошнім часам таксама выкарыстоўваецца для называння цэлай дысцыпліны, наўрад ці трэба ўжываць, паколькі ён ахоплівае не ўсе, а толькі некаторыя аспекты рэдагавання – кампазіцыйны, інфармацыйны, лінгвістычны, псіхалінгвістычны і лагічны» [8, с. 28].

Пераканаўча паспрабаваў унесці яснасць у занадта расшыраную трактоўку У. Рызуном паняццяў «літаратурнае рэдагаванне», «літаратурны аспект рэдагавання», «літаратурны рэдактар» А. Капялюшны. Не згаджаючыся з такім падыходам, ён прапануе просты адказ на гэтае пытанне: «Нішто не перашкаджае тут замест “літаратурнае рэдагаванне”, “літрэдактар” ужываць тэрміны “рэдагаванне”, “рэдактар”. І тады захаваецца поўнасцю змест усіх аспектаў рэдагавання – палітычнага, навуковага, літаратурнага. Толькі ўсе тры віды рэдагавання будзе выконваць адзін чалавек – рэдактар» [4, с. 9].

Мы цалкам падтрымліваем такую пазіцыю і для яе ўзмацнення прывядзём некалькі сваіх аргументаў.

Першы. Спроба абсалютызаваць адзін з аспектаў рэдагавання пры дапамозе механічнага накладання больш вузкага паняцця на больш шырокае ці замяніць сэнс першага паняцця другім супярэчыць прынятым правілам тэрмінаўтварэння. Тэрмін *літаратурнае рэдагаванне* з’яўляецца словазлучэннем, у якім галоўнае слова – назоўнік (рэдагаванне), а залежнае – прыметнік (літаратурнае). Аналагічна: *рэцэнзія – знешняя, унутраная; часопіс – навуковы, дзіцячы; выданне – кніжнае, газетнае; паказальнік – імянны, прадметны* і да д. п. Такім чынам, і *рэдагаванне – літаратурнае, навуковае, тэхнічнае, мастацкае*. Гэты рад можна доўжыць. Знешняя рэцэнзія не можа поўнасцю замяніць паняцця «рэцэнзія», газетнае

выданне не «перакрывае» ўсе іншыя віды выданняў. Таксама як і літаратурнае рэдагаванне не можа азначаць тое ж, што і рэдагаванне ў цэлым, або асобныя яго аспекты. Парушэнне лагічнасці і мэтазгоднасці тэрміналагічнай намінацыі адным словам ці словазлучэннем можа прывесці да паняційнага хаосу [13].

Другі. У журналісцкай практыцы на савецкай і постсавецкай прасторы здаўна разам з творчымі пасадамі рэдактараў у штатным раскладзе абавязкова вызначаліся пасады літаратурных рэдактараў. Іх галоўнай задачай якраз і было выпраўленне, удасканаленне мовы і стылю тэкстаў, а таксама моўнай культуры ўдзельнікаў радыё- і тэлеперадач або выканаўцаў роляў у кіно. На жаль, сёння, калі стыхія яшчэ не сфарміраванага рынку непасрэдна ўмяшалася і ў рэдакцыйны працэс, многія з заснавальнікаў друкаваных і электронных сродкаў інфармацыі з мэтай эканоміі сродкаў паўсюль пачалі скарачаць пасады літаратурных рэдактараў. Гэта адразу прыкметна знізіла ў першую чаргу моўную культуру такіх друкаваных выданняў, радыё- і тэлеперадач і фільмаў.

Трэці. У выдавецкай практыцы літаратурнае рэдагаванне ніколі не было самастойным этапам рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Рэдактар, які адказвае за канкрэтнае выданне, працуе адначасова над многімі аспектамі шматграннага працэсу рэдагавання, у тым ліку і над удасканаленнем літаратурнай формы аўтарскага арыгінала. У залежнасці ад складанасці выдання нярэдка ўзнікае неабходнасць размеркавання працы выдавецкіх работнікаў. Гэта бывае звычайна ў выпадках, калі аўтар не з'яўляецца спецыялістам-філолагам. Тады прыцягнуты для гэтага літаратурны рэдактар даводзіць аўтарскі арыгінал да кандыцыі перш за ўсё з літаратурнага боку.

Чацвёрты. Нашы погляды на літаратурнае рэдагаванне як на толькі адзін з відаў, ці, больш дакладна, аспектаў рэдагавання, які канцэнтруецца перш за ўсё ў моўнай і кампазіцыйнай плоскасцях выдання, цалкам супадаюць з поглядамі заходніх тэарэтыкаў і практыкаў рэдагавання. У працах даследчыкаў, напрыклад, з Вялікабрытаніі, ЗША, Канады, Польшчы цяжка знайсці паняцце «літаратурнае рэдагаванне». Не фіксуецца гэты тэрмін, у прыватнасці, у руска-англійскім і англа-рускім «Гласарыі выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў», падрыхтаваным Асацыяцыяй выдаўцоў Вялікабрытаніі (Лондан, 1997) [15]. Тэрмін *copy editor*, напрыклад, перакладаецца ў гэтым слоўніку як «рэдактар, які рыхтуе кні-

гу ў друк» (а не *літрэдактар*, як гэта перакладзена ў падручніку У. Рызуна). Трактоўка *копіэдытара* як «супрацоўніка, работа якога складаецца з праўкі і падрыхтоўкі тэксту да друку» падаецца і ў оксфардскім выданні слоўніка «Oxford Advanced Dearner's Dictionary. International Student's Edition» [16]. Менавіта пра розныя аспекты рэдагавання (сэнсавы, палітычны, моўны, стылістычны, тэхнічны, мастацкі і інш.) ідзе гаворка ў працах амерыканскіх аўтараў Вільяма Когіна і Лінет Портэр «Рэдагаванне для тэхнічных прафесій» (Editing for the Technical Professions) [17], Флойда Баскета, Джака Сісата і Браяна Брукса «Мастацтва рэдагавання» (The Art of Editing) [18], англічаніна Д. Доўбтфіра «Крэатыўнае пісанне» (Creative writing) [19], паляка Я. Тржынадлоўскага «Рэдагаванне. Тэкст. Мова. Апрацоўка» (Edytorstvo. Tekst, jezyk, opracowanie) [20].

Пяты. Усе гады на тэрыторыі СССР дысцыпліну, якую выкладалі будучым журналістам і рэдактарам-выдаўцам, называлі «Літаратурнае рэдагаванне» (у заходніх універсітэтах такі курс звычайна называюць «Рэдагаванне», «Рэдагаванне для…» (журналістаў, тэхнічных, гуманітарных спецыяльнасцей) або проста «Мастацтва рэдагавання»). Тлумачэнне гэтаму сапраўды савецкаму феномену А. Капялюшны дае так: «Паколькі вучэбныя планы і праграмы прысылалі з Масквы, там не маглі дазволіць, каб у яго (рэдагавання – *М. Ц.*) склад уваходзілі тэмы, якія ўзнімаюць іншыя, акрамя літаратурнага, аспекты рэдагавання» [4, с. 9]. Ва ўмовах, калі такія планы не мяняліся дзесяцігоддзямі, выдаць дапаможнік па гэтай праблематыцы з іншай назвай было немагчыма. Відавочна, толькі гэтым можна растлумачыць той факт, што ў першым вучэбным дапаможніку ўкраінскага аўтара Р. Іванчанкі пад назвай «Літературне редагування» няма сэнсу шукаць асобнага азначэння паняцця *літаратурнае рэдагаванне*: яго там няма. Кніжка прафесара Іванчанкі прысвечана проста рэдагаванню. Не палемізуючы ні з кім, Р. Іванчанка, як і іншы заснавальнік украінскай школы рэдагавання Д. Грыгараш, пісала ў сваіх тэкстах «рэдагаванне», «змест рэдагавання», «аб'ём работы рэдактара», не звужаючы шырокае кола рэдактарскіх абавязкаў азначэннем «літаратурнае». Такі падыход, дарэчы, выкарыстоўвалі і вядучыя расійскія даследчыкі гэтай праблемы М. Сікорскі, К. Накаракава, В. Свінцоў, А. Мільчын. Укладаючы ў працэс рэдагавання шырокі творчы або творча-арганізацыйны змест, яны мелі на ўвазе рэдагаванне, а не літаратурнае рэдагаванне.

Такім чынам, наша вызначэнне паняццяў *рэдагаванне* і *літаратурнае рэдагаванне* будзе такім.

Рэдагаванне – гэта від прафесійнай дзейнасці, які прадугледжвае паслядоўнае выкананне спецыяльна падрыхтаваным работнікам шэрагу абумоўленых вынікамі рэдактарскага аналізу творчых і арганізацыйна-тэхнічных функцый на розных этапах падрыхтоўкі і выпуску канкрэтнага выдавецкага, журналісцкага, газетна-часопіснага або кінапрадукту і які накіраваны на ўдасканаленне зместу і формы такога прадукту з мэтай выніковага ўспрымання яго карыстальнікам.

Літаратурнае рэдагаванне – гэта разнавіднасць рэдагавання, якая прадугледжвае паслядоўнае выкананне спецыяльна падрыхтаваным работнікам шэрагу творчых функцый, накіраваных на ўдасканаленне мовы, стылю, кампазіцыі, структуры канкрэтнага выдавецкага, журналісцкага, газетна-часопіснага або кінапрадукту.

На наш погляд, такі падыход да рашэння праблемы можа садзейнічаць збліжэнню, а не раз'яднанню розных пунктаў гледжання даследчыкаў на прадмет, змест і састаўныя часткі рэдагавання – аднаго з асноватворных паняццяў у тэорыі і практыцы выдавецкай справы і рэдагавання.

Літаратура

1. Былинский, К. И. Литературное редактирование газеты / К. И. Былинский. – М. : Гослитиздат, 1953. – 64 с.

2. Былинский, К. И. Литературное редактирование / К. И. Былинский, Д. Э. Розенталь. – 2-е изд. – М. : Искусство, 1961. – С. 15.

3. Зелінська, Н. В. Теоретичні засади роботи редактора над літературною формою твору (літературне опрацювання тексту) / Н. В. Зелінська. – К., 1989. – С. 5.

4. Капелюшний, А. Редагування в засобах масової інформації : Навч. посібник / А. Капелюшний. – Львів : ПАІС, 2005. – 432 с.

5. Литературное редактирование : учеб. пособие / под ред. Н. С. Валгиной. – М. : Московский полиграф. ин-т, 1987. – 88 с.

6. Мильчин, А. Э. Издательский словарь-справочник / А. Э. Мильчин. – М. : Юристъ, 1998. – 470 с.

7. Огар, Е. І. Українсько-російський та російсько-український словник-довідник з видавничої справи / Е. І. Огар. – Львів : Палітра друку, 2002. – 264 с.

8. Партико, З. Загальне редагування: нормативні основи : навч. посібник / З. Партико. – Львів : Афіша, 2001. – 412 с. – С. 28.

9. Різун, В. В. Літературне редагування : підручник / В. Різун. – К. : Либідь, 1996. – С. 73.

10. Сенкевич, М. П. Стилистика научной речи и литературное редактирование научных произведений / М. П. Сенкевич. – 2-е изд. – М. : Высшая школа, 1984. – С. 21.

11. Сикорский, Н. М. Теория и практика редактирования : учебник / Н. М. Сикорский. – 2-е изд. – М. : Высшая школа, 1980. – 368 с.

12. Терехова, В. Литературное редактирование / В. Терехова. – Л. : Изд-во Ленинградского ун-та, 1975. – С. 3–4.

13. «Термін», «Термінологія», «Словосполучення» в: Українська мова : енциклопедія. – 2-ге вид. – К. : Вид-во «Укр. Енцикл.» ім. М. Бажана, 2004; Літературознавча енциклопедія : у 2 т. / авт-уклад. Ю. І. Ковалів. – К. : ВЦ «Академія», 2007.

14. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка публіцыстычных жанраў / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Вышэйшая школа, 1971. – 288 с.

15. Glossary of Publishing Terminology / The Publishers Association UK, 1997 [Electronic resource]. – Mode of access : http:www.osi.hu/cpd/resources/paglossaryRUS.htm/.

16. Oxford Advanced Dearner's Dictionary. International Student's Edition. – P. 325.

17. Coggin, W. Editing for the Technical Professions / W. Coggin, L. Porter. –Toronto, 1993. – 254 p.

18. Baskette, F. The Art of Editing / F. Baskette, J. Sissors, B. Bruks. – New York – London, 1982.

19. Doubtfire, D. Creative writing / D. Doubtfire. – London, 1999. – 148 p.

20. Trzynadlowski, J. Edytorstvo. Tekst, jezyk, opracowanie / J. Trzynadlowski. – Warszawa, 1978. – 174 s.